# ЗАПРАШАЕ ВДУ!

**_Больш за 700 школьнікаў з горада Віцебска і вобласці сабраліся на Дзень адкрытых дзвярэй у ВДУ імя П.М. Машэрава ў першую суботу снежня. Патэнцыяльныя абітурыенты вырашылі выкарыстаць магчымасць бліжэй пазнаёміцца з універсітэтам, у якім мараць навучацца, даведацца аб факультэтах і спецыяльнасцях, а дзякуючы захапляльнаму выступу творчых калектываў, упэўніцца, што ў ВДУ будзе не толькі цікава вучыцца, але і весела і творча праводзіць студэнцкія гады._**

Пасля рэгістрацыі і наведвання інтэрактыўных пляцовак факультэтаў навучэнцаў, іх бацькоў і настаўнікаў у актавай зале галоўнага корпуса вітаў першы прарэктар Андрэй Мехавіч, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт. Андрэй Паўлавіч адзначыў, што ВДУ сёння – гэта 10 факультэтаў, два каледжы і ліцэй. Гэта больш за 10 тысяч навучэнцаў. Мажлівасць не толькі вучыцца, але і займацца навукай, творчасцю, валанцёрствам, спортам, спрабаваць сябе ў медыясферы. Гэта шанец для хлопцаў паступіць на ваенную кафедру і разам з дыпломам аб вышэйшай адукацыі атрымаць званне лейтэнанта запаса, а для іншагародніх студэнтаў – пражыць студэнцкія гады ў камфартабельным інтэрнаце.

«У мінулым годзе мы ўпершыню апрабіравалі новы механізм паступлення – універсітэцкую алімпіяду. Сёлета абітурыенты таксама могуць прыняць удзел у алімпіядзе па адным або некалькім прадметам і ўжо ў чэрвені быць залічанымі на адну з 16 сучасных запатрабаваных спецыяльнасцей», – адзначыў Андрэй Мехавіч.

Пра яшчэ адзін варыянт паступлення расказала дырэктар Ліцэя ВДУ Наталля Шчаглова. Школьнікі, якія скончылі дзевяць класаў, могуць здаць уступныя іспыты і два гады навучацца ў Ліцэі ВДУ па адным з трох профіляў, а пасля атрымаць магчымасць стаць студэнтам універсітэта без экзаменаў.

Я ж пацікавілася ў старшакласнікаў, на які факультэт яны плануюць паступаць.

**Дар'я ЛУЗГІНА (Полацкі каледж):**

– Я творчая асоба і хачу развівацца ў гэтым кірунку, таму збіраюся паступаць на спецыяльнасць «Мастацкая адукацыя». У будучым хацела б займацца камп'ютарнай графікай, напрыклад, маляваць камп'ютарныя гульні.



**Аліна ПАГАРЭЛАВА (Кастрычніцкая сярэдняя школа Віцебскага раёна імя І.П. Собалева):**

– Мяне прываблівае прафесія дэфектолага. Працаваць у гэтай сферы вельмі цікава, пазнавальна і карысна нават для сябе самой. Да кожнага маленькага чалавека трэба ўмець знаходзіць падыход, і я веру, што ў мяне гэта атрымаецца, бо мне падабаецца ўзаемадзейнічаць з дзецьмі. Да таго ж я ведаю, што ў ВДУ будзе цікава вучыцца яшчэ і таму, што тут насычанае творчае жыццё. Я ўжо змагла ў гэтым асабіста ўпэўніцца, калі дапамагала сяброўцы-студэнтцы выступаць з танцавальным нумарам на адным з конкурсаў ва ўніверсітэце.

**Елізавета ПІВАВАРАВА (сярэдняя школа №20 г. Оршы імя І.А. Флёрава):**

– Я два гады займалася плаваннем, затым, вось ужо восем гадоў, валейболам. Неаднаразова прымала ўдзел у спартыўных спаборніцтвах, у тым ліку на рэспубліканскім узроўні, у складзе каманды займала прызавыя месцы. Таму невыпадкова я збіраюся падаваць дакументы на факультэт фізічнай культуры і спорту. Упэўнена, што мне спадабаецца тут вучыцца, адразу бачна: гэта цудоўны ўніверсітэт.

**Іван ЖЭЎЛАКОЎ (сярэдняя школа №25 г. Віцебска):**

– Мне больш за ўсё падабаюцца ўрокі рускай і англійскай моў, якія у нашай школе выкладаюць цудоўныя настаўнікі. Ужо на працягу некалькіх гадоў я ўдзельнічаю ў алімпіядах па гэтых прадметах, паказваю добрыя вынікі. Думаю выбраць спецыяльнасць «Рамана-германская філалогія». Мне падаюцца цікавымі абедзве прафесіі: і настаўніка, і перакладчыка. Напрыклад, калі ў нашай школе праходзіў Дзень самакіравання, я з задавальненнем вёў урокі.

**Арына КРАСОЎСКАЯ (сярэдняя школа №46 г. Віцебска імя І.Х. Баграмяна):**

– Я ўжо даўно пазнаёмілася з ВДУ, бо наведваю курсы падрыхтоўкі да ЦТ і ЦЭ па рускай мове. Іх у нашай групе вядзе Таццяна Слесарава – цудоўны выкладчык, якая даступна і цікава падае матэрыял, дапамагае разабрацца ва ўсіх нюансах рускай мовы. Дзякуючы ёй, я адчуваю ўпэўненасць, што змагу добра здаць іспыты. Мяркую, што буду паступаць на педагагічны факультэт.

**Алеся ДУБРОЎСКАЯ.**
**Здымак Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**

Фота- і відэарэпартаж глядзіце з дапамогай QR-кода.